Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
__________Д.В.Герасімёнак
«19» лістапада 2024 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________Ю.М.Галкоўская
«19» лістапада 2024 г.

# ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ АНАМАСТЫКА

для спецыяльнасці 6-05-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»

Складальнік: Колабава І.Н., дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый
«19» лістапада 2024 г. пратакол № 3

Рэцэнзенты:

*Кафедра археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт» (пратакол№ 1 ад 03.09.2024 г.)*

*Кавалёва Ю.В., загадчык аддзела экспазіцыйна-выставачнай работы ДУ «Музей гісторыі горада Мінска», кандыдат культуралогіі*

Разгледжаны і абмеркавана на пасяджэнні кафедры гісторыка-культурнай спадчыны

(пратакол № 3-ад 31.10.2024 г.);

**ЗМЕСТ**


1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4

2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 6

2.1 План-канспект лекцый 6

3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 10

3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 10

4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 12

4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў 12

4.2 Пытанні для экзамена 12

5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 14

5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны 14

5.2 Асноўная літаратура 15

5.3 Дадатковая літаратура 15

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Анамастыка» для студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» распрацаваны на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны», вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Рэгістрацыйны нумар 6-05-03-29/23 вуч.ад 15.02.2023 г.

Актуальнасць дадзенай вучэбнай дысцыпліны вызначаецца яе роляй у працэсе падрыхтоўкі навуковых супрацоўнікаў музейных і турыстычных устаноў.

Вывучэнне спецыяльных гістарычных дысцыплін спрыяе падрыхтоўцы студэнтаў да практычнай дзейнасці, да больш паглыбленага аналізу і апісання розных відаў гістарычных крыніц. Авалоданне тэарэтычнымі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню ўсебакова развітога спецыяліста ў галіне музейнай справы.

Мэта вывучэння дысцыпліны «Анамастыка» – сфарміраваць у студэнтаў першасныя прафесійныя кампетэнцыі ў сферы гісторыі ўзнікнення і фарміравання імёнаслоўных, тапанімічных, этнанімічных і інш. сістэм на тэрыторыі Беларусі, накіраваць іх на выкарыстанне атрыманых ведаў і арганізацыю самастойнай работы ў музейнай і турыстычнай дзейнасці.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны «Анамастыка» акрэслівае шэраг задач:

– прасачыць на фактычным матэрыяле гісторыю станаўлення і развіцця імёнаслоўных, тапанімічных, этнанімічных і інш. сістэм на тэрыторыі Беларусі;

– выявіць характэрныя асаблівасці сістэмы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусі на прыкладзе анаматычных сістэм.

– выпрацаваць у студэнтаў уменні па апрацоўцы атрыманай інфармацыі, рабоце з літаратурай і крыніцамі.

Зместам вучэбнай дысцыпліны ў адпведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадыны» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый:

СК – 4 Прымяняць метады і дасягненні спецыяльных гістарычных дысцыплін для выяўлення, крытычнага аналізу і інтэрпрэтацыі музейных крыніц.

СК – 5 Планаваць і выконваць работу па бягучаму і перспектыўнаму камплектаванню музейных калекцый, іх уліку і выкарыстанню ў экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці ў адпаведнасці з прававымі нормамі і прынцыпамі музейнай этыкі.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны забяспечвае студэнтаў зыходнымі ведамі аб:

– прадмеце даследавання спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны «Анамастыка»;

– гістарычных ўмовах развіцця анамачтыкі;

– прыёмах даследавання ў дадзеным кірунку;

– методыцы самастойнай работы з крыніцамі і апрацоўцы інфармацыі;

– методыцы выкарыстання набытых ведаў у музейнай і турыстычнай працы;

– навуковых дасягненнях айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне;

Дысцыпліна накіравана на выпрацоўку ў студэнтаў ўменняў:

– выкарыстання прыёмаў і метадаў навуковай апрацоўкі музейных калекцый;

– выкарыстання базавых ведаў пры правядзенні практычнай і навуковай работы;

– выкарыстання інфармацыйных крыніц ў музейнай працы;

– выкарыстання найноўшых навуковых дасягненняў айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне ў фондавай і экспазіцыйнай музейнай рабоце.

Студэнты павінны авалодаць:

– навыкамі сістэматызацыі атрыманых ведаў;

– навыкамі стварэння інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме курса.

Асноўнымі формамі навучання па дысцыпліне з’яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, у фондах якіх знаходзяцца геральдычныя калекцыі.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Анамастыка» выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і кампутарныя тэхналогіі.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў укараняюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Анамастыка» распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі іншых вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца на кафедры гісторыка-культурнай спадчыны («Археалогія», «Этналогія і этнаграфія Беларусі», «Гісторыя Беларусі” і інш.).

Форма кантролю ведаў –залік.

## 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 2.1 План канспект лекцый

Уводзіны. Складовыя часткі анамастыкі. Прадмет, задачы і крыніцы анамастычных даследаванняў. Гістарыяграфічны агляд

Вызначэнне анамастыкі як навуковай дысцыпліны. Этымалогія тэрміна анамастыка. Асноўныя складовыя часткі анамастыкі (антрапаніміка, тапаніміка, этнаніміка). Прадмет, задачы і крыніцы анамастычных даследаванняў.

Спецыяльная тэрміналогія (анімія, анамасцікон, антрапанімія, тапанімія, этнанімія, тэанімія, касманімія, заанімія і інш.).

Гістарыяграфічны агляд развіцця беларускай анамастыкі. Сувязь яе з іншымі навукамі.

### Раздзел I Антрапаніміка

Тэма 1 Найменне асобы: узнікненне, функцыі і шматкампанентнасць

Этымалогія тэрміна антрапаніміка. Прадмет, задачы і крыніцы антрапанімікі. Гістарыяграфічны агляд развіцця беларускай антрапанімікі.

Значэнне ўласнага імя ў свядомаці чалавека. Роля іменавання асобы ў сацыяльным жыцці грамацтва.

Агульны агляд традыцый еўраазіяцкіх імёнаслоўных сістэм.

Тэма 2 Усходнеславянская імёнаслоўная сістэма

Фарміраванне імёнаслоўнай сістэмы ўсходнеславянскага насельніцтва. Перыядызацыя гісторыі развіцця ўсходнеславянскай імёнаслоўнай сістэмы.

Асноўныя функцыі дахрысціянскіх імён (ідэнтыфікацыйная, засцерагальная). Традыцыі ва ўтварэнні дахрысціянскіх імён.

Рэканструкцыя і класіфікацыя старажытнаславянскіх імён па пісьмовых крыніцах XIV–XVI стст.

Тэма 3 Беларуская імёнаслоўная сістэма ў XIV – пачатку XX ст.

Старажытнабеларуская імёнаслоўная сістэма. Крыніцы, асаблівасці складання беларускага імёнаслова. Старажытныя ўласныя імёны: зніклыя і актуальныя.

Хрысціянскія кананічныя імёны ў беларускім імёнаслове. Размоўна-пабытовыя формы імёнаў беларускага насельніцтва. Эмацыйна-каштоўнасныя формы імя.

Двух-, трох-, чатырохслоўныя формы наймення асобы.

Працэс адаптавання іншамоўных уласных імён у беларускай мове (пераход Е→О→А; Ф→П; Ф→ХВ; спрашчэння груп галосных і зычных; страты пачатковага галоснага А; замены КТ на ХТ; змены В на У і інш.).

Імёны выбітных асоб у гісторыі Беларусі.

Тэма 4 Беларуская імёнаслоўная сістэма ў XX – пачатку XXI ст.

Прычыны навацый у імёнаслове беларускага насельніцтва. Антрапаністычны бум у 1920–1930-х гг. Штучныя ўласныя імёны савецкага часу.

Агульная характарыстыка імёнаслоўнай сістэмы ў другой палове XX ст. (дэхрысціянізацыя беларускага іменніка, уплыў урбанізацыі, знікненне адрознення паміж іменнікамі розных колаў насельніцтва, адраджэнне старажытнаславянскіх імён, узрастанне папулярнасці кананічных хрысціянскіх імён).

Тры складовыя элементы (імя ўласнае, імя па бацьку, прозвішча) ў сучасным афіцыйным найменні асобы на тэрыторыі Беларусі.

Асаблівасці фарміравання і функцыі імя па бацьку.

Вызначэнне паняцця прозвішча, яго функцыі, крыніцы ўтварэння. Класіфікацыя ўсходнеславянскіх славянскіх прозвішчаў (агульнаславянскія, усходнеславянскія, унутрымоўныя).

Вызначэнне этымалогіі ўласных імён, імён па бацьку і прозвішчаў на прыкладзе імён студэнтаў вучэбнай групы.

Тэма 5 Мянушка: прычыны ўзнікнення, класіфікацыя

Мянушка як адна з найбольш старажытных антрапанімічных форм. Функцыі мянушкі (ідэнтыфікацыйная, засцерагальная, эмацыйна-каштоўнасная, інфармацыйная, камунікатыўная). Мянушкі вядомых асоб у гісторыі Беларусі.

Прычыны існавання мянушак у сучасным жыцці.

Сэнсавая класіфікацыя мянушак паводле іх сэнсу (час нараджэння, статус у сям'і, знешні выгляд, характар, прафесія, разумовыя здольнасці чалавека і інш.).

Тэма 6 Псеўданім: прычыны ўзнікнення, класіфікацыя

Прычыны ўзнікнення, спецыфіка і фунцыі псеўданіма.

Класіфікацыя псеўданімаў (псеўдаандронімы, псеўдагінімы; сапраўдныя псеўданімы, абагульняльныя псеўданімы; крыптанімы і інш.).

Псеўданімы грамацкіх і палітычных дзеячаў у гісторыі Беларусі XIX–XXI стст. Псеўданімы ў літаратуры і мастацтве.

## Раздзел II Тапаніміка

Тэма 7 Тапонімы – помнікі гісторыі і культуры Беларусі

Этымалогія тэрміна тапаніміка. Прадмет, задачы і крыніцы тапанімікі. Гістарыяграфічны агляд развіцця беларускай тапанімікі.

Спецыяльная тэрміналогія (айконімы, палісонімы, камонімы, аронімы, гідронімы і інш.). Лінгвістычная і сэнсавая класіфікацыя тапонімаў.

Тапонімы як помнікі гісторыі і культуры краіны.

Фактары, фарміруючыя тапонімы Беларусі (гістарычны, духоўна-рэлігійны, этнічны, лінгвістычны, прыродны, адміністратыўны).

Мікратапонімы. Вызначэнне, паходжанне, асаблівасці бытавання.

Алгарытм вывучэння этымалогіі тапоніма.

Тэма 8 Гідронімы: спецыфіка ўтварэння і класіфікацыя

Этымалогія тэрміна гідронім. Крыніцы і спецыфіка ўзнікнення назваў рэк на тэрыторыі Беларусі (старажытнасць, дваістасць, паўторы, замацаванне назвы ў прылягаючых раёнах і інш.).

Лінгвістычная і сэнсавая класіфікацыя назваў рэк Беларусі.

Крыніцы і спецыфіка ўзнікнення назваў азёр на тэрыторыі Беларусі (нестаражытнасць паходжання, няўстойлівасць і інш.).

Лінгвістычная і сэнсавая класіфікацыя назваў азёр Беларусі.

Тэма 9 Айконімы: спецыфіка ўтварэння і класіфікацыя

Этымалогія тэрмінаў айконім, палісонім, камонім.

Тыпы беларускіх паселішчаў (вёска, засценак, ваколіца, фальварак, мястэчка, горад). Лінгвістычная класіфікацыя айконімаў.

Сэнсавая класіфікацыя айконімаў (уплыў прыродных, ландшафтных, сацыяльна-эканамічных характарыстык; патранімічнае, рэлігійнае і культавае паходжанне; айконімы-саветызмы і інш.).

Тэма 10 Урбанонімы: спецыфіка ўтварэння і класіфікацыя. Афіцыйная і неафіцыйная ўрбананімія

Этымалогія тэрміна ўрбанонім. Прадмет, задачы і крыніцы даследавання назваў гарадскіх аб'ектаў. Спецыяльная тэрміналогія (агаронімы, драмонімы, гадонімы, эргонімы). Структура ўрбанонімаў (наяўнасць не менш двух кампанентаў).

Афіцыйныя і неафіцыйныя ўрбананімы.

Спецыфічныя рысы афіцыйных урбанонімаў (нацыянальная афарбоўка, магчымасць перайменаванняў, нізкая ступень вядомасці, слабая сувязь з дыялектам, перавага штучных назваў над натуральнымі, пісьмовая фіксацыя, уплыў сацыяльна-палітычнага фактару, здольнасць уключаць у сябе назвы іншых анамастычных разрадаў – хранонімаў і антрапонімаў).

Прычыны ўзнікнення і спецыфічныя рысы неафіцыйных урбанонімаў.

Урбананімічная гісторыя Беларусі і яе перыядызацыя.

Тыпы гадонімаў (у форме аднаго-двух прыметнікаў, нумараваная, апісальная і нумаравана-апісальная формы, назвы вуліц у родным склоне, спалучэнне парадкавага лічэбніка, прыметніка і геаграфічнага апелятыва, скарочаныя назвы, абрэвіятура).

Перайменаванні гарадскіх аб'ектаў.

Вызначэнне паходжання асобных урбанонімаў.

## Раздзел ІІІ Этнаніміка

Тэма 11 Этнонімы: спецыфіка ўтварэння і класіфікацыя

Этымалогія тэрміна этнаніміка. Прадмет, задачы і крыніцы этнанімікі.

Агульная характарыстыка этнонімаў (кансерватыўнасць, устойлівасць, захоўванне носьбітамі).

Значэнне вывучэння этнонімаў пры даследаванні зніклых этнасаў.

Прамыя і адваротныя суадносіны этнонімаў з тапонімамі.

Спецыяльная тэрміналогія (алаэтнонімы, аўтаэтнонімы, макраэтнонімы, мікраэтнонімы, этнаантрапонімы, этнатапонімы, этнахаронімы і інш.)

Тэма 12 Этнонімы – помнікі гісторыі і культуры Беларусі

Саслоўная і канфесіянальная дыферэнцыяцыя беларускага насельніцтва (этнасацыяльныя, этнаканфесіянальныя, лакальна-тэрытарыяльныя групы).

Гісторыя выкарыстання тэрмінаў Белая Русь, Чорная Русь, Русь Літоўская, Заходняя Русь, Паўночна-Заходні край, Беларусія, Беларусь.

## 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

Семінарскія заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да сварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме.

**Семінарскія заняткі № 1**
**Беларуская імёнаслоўная сістэма ў ХХ – пачатку ХХІ ст.**

1.Гісторыя складання іменаслоўнай сістэмы ўсходніх славян.

2.Асноўныя функцыі дахрысціянскіх імён.

3.Уплыў хрысціянскіх традыцый на імёнаслоў.

4.Агульная характарыстыка іменніка беларускага насельніцтва ў ХХ ст.

5.Антрапанімістычны бум у 1920-30-х гг.

6.Матывацыя выбару імя і агульная характарыстыка імёнаслоўнай сістэмы ў другой палове ХХ ст.

Літаратура

Бірыла, М.В. Анамастычная тэрміналогія /М.В. Бірыла //Тэрміналагічны зборнік "87–"88 /АН БССР; Рэсп. тэрмінал. камісія; ІМ. – Мн.: Нав. і тэх., 1993. С. 25–40.

Буданова, В.П. Этнонимика племен Западной Европы /В.П. Буданова. – М.:ИВИ, 1991. – С. 5–11.

Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии /В.А. Жучкевіч. – Мн.: Изд-во БГУ, 1974. – 447 с.

Лыч, Л.М. Назвы зямлі беларускай /Л.М. Лыч. – Мн.: Універсітэцкае, 1994. – 128 с.

Мезенка, Г.М. Беларуская анамастыка /Г.М. Мезенка. – Мн.: Выш.шк., 1997. – С. 6–14.

Филиппов, И.С. Ономастика /И.С. Филиппов /Введение в специальные исторические дисциплины. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1990. – С. 199 – 230.

Этническая ономастика. – М: Наука., 1984. – 192 с.

Этническая топонимика. – М.: МФГО, 1987. – 143 с.

Юрэвіч, У. Слова жывое, роднае, гаворкае… /У. Юрэвіч – Мн.: Маст.літ., 1998. – 282 с.

**Семінарскія заняткі № 2-3**
**Тапонімы – помнікі гісторыі і культуры Беларусі**

1.Выкарыстанне тапанімічных звестак ў гісторыі, філалогіі і геаграфіі.

2.Тапанімічныя легенды.

3.Лінгвістычная класіфікацыя тапонімаў.

4.Сэнсавая класіфікацыя тапонімаў.

5.Фактары, фарміруючыя тапонімы Беларусі.

6.Мікратапонімы.

7.Алгарытм вывучэння этымалогіі тапоніма.

8. Паходжанне асобных тапонімаў (назвы кантынентаў, краін, гарадоў, вёсак, прыродных аб’ектаў).

Літаратура

Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии /В.А. Жучкевіч. – Мн.: Изд-во БГУ, 1974. – 447 с.

Жучкевич, В.А. Общая топонимика /В.А. Жучкевіч. – Мн.: Выш. шк., 1980. – 287 с.

Лемцюгова, В.П. Беларуская айканімія /В.П. Лемцюгова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1970. – 158 с.

Лемтюгова, В.П. Восточнославянская ойконимия апелятивного происхождения: Названия типов поселений /В.П. Лемтюгова /АН БССР. ИЯ. Мн.: Наук и тех., 1983. – С. 153–194.

Лыч, Л.М. Назвы зямлі беларускай /Л.М. Лыч. – Мн.: Універсітэцкае, 1994. – 128 с.

Никонов, В.А. Введение в топонимику /В.А.Никонов. – М.: Наука, 1965. – 179 с.

Рылюк, Г. Я. Истоки географических названий Беларуси /Г. Рылюк. – Мн.: ЗАО “Веды”, 1999. – 235 с.

Суперанская, А.В. Что такое топонимика? /А.В. Суперанская. – М.: Наука, 1985. – 177 с.

**Семінарскія заняткі № 4**

**Этнонімы – помнікі гісторыі і культуры Беларусі**

1. Этнонімы – помнікі гісторыі і культуры Беларусі.

2.Фактары фарміравання этнонімаў.

3.Класіфікацыя этнонімаў.

4.Этымалогія асобных этнонімаў (па выбару).

Літаратура

Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии /В.А. Жучкевіч. – Мн.: Изд-во БГУ, 1974. – 447 с.

Буданова, В.П. Этнонимика племен Западной Европы /В.П. Буданова. – М.:ИВИ, 1991. – С. 5–11.

Этническая ономастика. – М: Наука., 1984. – 192 с.

Этническая топонимика. – М.: МФГО, 1987. – 143 с.

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтов

Самастойная работа разлічана на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ, у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме (па выбару).

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай. Кантроль за выкананнем СРС адбываецца ў адпаведнасці з дадатковым раскладам.

1.Вызначыць этымалогію паняццяў "анамастыка", "антрапаніміка", "тапаніміка", "этнаніміка".
2.Вызначыць прадмет вывучэння "анамастыкі", "антрапанімікі", "тапанімікі", "этнанімікі".
3.Даць прыклады спецыяльнай тэрміналогіі.
4.Даць прыклады рэканструкцыі імёнаслова ўсходніх славян дахрысціянскіх часоў.
5.Назваць крыніцы фарміравання беларускага імёнаслова.
6.Вызначыць спецыфіку фарміравання беларускага імёнаслова.
7.Назваць спецыфічныя рысы беларускай імёнаслоўнай сістэмы XIV – XIXстст.
8.Вызначыць новыя тэндэнцыі ў беларускай імёнаслоўнай сістэме ў XX ст.
9.Вызначыць паходжанне ўласнага імя.
10.Вызначыць паходжанне ўласнага імя па бацьку.
11.Вызначыць паходжанне ўласнага прозвішча.
12.Вызначыць паняцце "мянушка".
13.Вызначыць паняцце "псеўданім".
14.Чаму тапонімы з'яўляюцца помнікамі гісторыі і культуры.
15.Даць класіфікацыю айконімаў.
16.Даць класіфікацыю гідронімаў.
17.Даць класіфікацыю і назваць спецыфічныя рысы урбанонімаў.
18.Вызначыць крыніцы ўзнікнення неафіцыйных урбанонімаў.
19.Чаму этнонімы з'яўляюцца помнікамі гісторыі і культуры.
20.Вызначыць этымалогію асобных этнонімаў (па выбару).

## 4.2 Пытанні да заліка

### Пытанні да заліку па курсу "Анамастыка"

1.Вызначэнне анамастыкі як навуковай дысцыпліны.
2.Спецыяльная анамастычная тэрміналогія.
3.Састаўныя часткі анамастыкі. Агульная характарыстыка.
4.Гісторыя фарміравання беларускага імёнаслова.

5.Асаблівасці старажытнай імёнаслоўнай сістэмы ўсходнеславянскага насельніцтва.

6.Беларуская імёнаслоўная сістэма ў XIV – XIX стст.

7.Беларуская імёнаслоўная сістэма ў XX ст.

8. Гісторыя фарміравання элементаў іменавання асобы. Імя ўласнае.

9. Гісторыя фарміравання элементаў іменавання асобы. Імя па бацьку і прозвішча.

10. Гісторыя фарміравання элементаў іменавання асобы. Прозвішча.

11.Асаблівасці выкарыстання мянушак.

12.Паходжанне псеўданімаў.

13.Класіфікацыйныя групы псеўданімаў.

14.Вызначэнне паходжання ўласнага імя і прозвішча.

15.Прадмет вывучэння і задачы заанімii.

16.Прадмет вывучэння і задачы касманіміі.

17.Прадмет вывучэння і задачы тапанімікі.

18.Сэнсавая класіфікацыя айконімаў. Агульная характарыстыка.

19.Айконімы, звязаныя па сэнсу з сацыяльна-эканамічнымі з’явамі.

20.Айконімы, звязаныя па сэнсу з прыроднымі з’явамі.

21.Айконімы, звязаныя па сэнсу з назвамі этнічных груповак.

22.Сэнсавая класіфікацыя гідронімаў. Назвы рэк.

23.Сэнсавая класіфікацыя гідронімаў. Назвы азёраў.

24.Прадмет вывучэння і задачы урбаніміі.

25.Афіцыйныя урбанонімы.

26.Неафіцыйныя урбанонімы.

27.Этымалогія асобных тапонімаў.

28.Прадмет вывучэння і задачы этнанімікі.

29.Этымалогія асобных этнонімаў.

30.Спецыяльная этнанімічная тэрміналогія.

# 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | семінар. заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | | 5 |
| 1 | Уводзіны. Складовыя часткі анамастыкі. Прадмет, задачы і крыніцы анамастычных даследаванняў. Гістарыяграфічны агляд | 2 | | 4 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 2 | Тэма 1 Найменне асобы: узнікненне, функцыі і шматкампанентнасць | 2 | 2 | 6 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 3 | Тэма 2 Усходнеславянская імёнаслоўная сістэма | 2 | | 4 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 4 | Тэма 3 Беларуская імёнаслоўная сістэма ў XIV – пачатку XX ст. | 2 | | 4 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 5 | Тэма 4 Беларуская імёнаслоўная сістэма ў XX – пачатку XXI ст. | 4 | 2 | 4 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 6 | Тэма 5 Мянушка: прычыны ўзнікнення, класіфікацыя | 2 | | 2 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 7 | Тэма 6 Псеўданім: прычыны ўзнікнення, класіфікацыя | 2 | | 2 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 8 | Тэма 7 Тапонімы – помнікі гісторыі і культуры Беларусі | 2 | 4 | 6 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 9 | Тэма 8 Гідронімы: спецыфіка ўтварэння і класіфікацыя | 2 | | 2 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 10 | Тэма 9 Айконімы: спецыфіка ўтварэння і класіфікацыя | 4 | 2 | 4 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 11 | Тэма 10 Урбанонімы: спецыфіка ўтварэння і класіфікацыя. Афіцыйная і неафіцыйная ўрбананімія | 2 | | 4 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 12 | Тэма 11 Этнонімы: спецыфіка ўтварэння і класіфікацыя | 2 | | 6 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| 13 | Тэма 12 Этнонімы – помнікі гісторыі і культуры Беларусі | 2 | | 2 | падрыхтоўка іправерка эл. прэзентацый |
| Разам | | 30 | 10 | 50 | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## Літаратура

## АНАМАСТЫКА

### Асноўная літаратура


1. Леонтьева, Галина Александровна. Вспомогательные исторические дисциплины: учебник для студентов высших учебных заведений / Г. А. Леонтьева, П. А. Шорин, В. Б. Кобрин; под ред. Г. А. Леонтьевой. - Москва : ВЛАДОС, 2000, - 365, [2] с.
2. Ономастика Беларуси. Топонимия : учебник для студентов учреждений высшего образования по филологическим специальностям / А. М. Мезенко [и др.]. - Минск : РИВШ, 2018. - 319 с.
3. Ономастика Беларуси. Антропонимия : учебник для студентов учреждений высшего образования по филологическим специальностям / А. М. Мезенко [и др.]. - Минск : РИВШ, 2017. - 397 с.


### Дадатковая літаратура


1. Аліферчык, Т. М. Тапанімікон Пінскага Палесся ў рэтраспектыdt / Т. М. Аліферчык // Гістарычнае мовазнаўства ў кантэксце міждысцыплінарных даследаванняў : зборнік артыкулаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 25-26 кастрычніка 2017 г.) / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі [і інш.] - Мінск, 2017. - С. 14 - 18.
2. Анамастыка // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 1. А - Аршын / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і. інш.]. - Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1996. - С. 337.
3. Бірыла, Мікалай Васільевіч. Выбраныя працы / М. В. Бірыла; [уклад.: Л. А. Ліхадзіеўская, В. П. Русак, Н. А. Чабатар]. - Мінск : Беларуская навука, 2017. - 541, [1] с.
4. Грушко, Елена Арсеньевна. Словарь фамилий : [около 10 000 фамилий] / Елена Грушко, Юрий Медведев. - Нижний Новгород : Три богатыря: Братья славяне, 1997. - 590, [1] с.
5. Жучкевич, Вадим Андреевич. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. - Мінск : Изд-во БГУ, 1974. - 447 , [1] с.
6. Лыч, Леанід Міхайлавіч. Назвы зямлі беларускай / Л. М. Лыч. - Мінск : Універсітэцкае, 1994. - 125, [3] с.
7. Мезенка, Ганна Міхайлаўна. Тапанімікон Беларускага Паазер'я як крыніца вывучэння асаблівасцяў развіцця рэгіёна / Г. А. Мезенка // Беларуская мова - галоўная гісторыка-культурная каштоўнасць нацыі і дзяржавы : (да 90-годдзя Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа) : зборнік навуковых артыкулаў : у 2 ч. / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. - Мінск, 2021. - Ч. 2. - С. 65 - 71.

8. Никонов, Владимир Андреевич. Словарь русских фамилий / В. А. Никонов; сост. Е.Л.Крушельницкий. - Москва : Школа-Пресс, 1993. - 222 с.

9. Саламевіч, Янка. Слоўнік беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў (XVI-XX стст.) / Я. Саламевіч. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. - 205, [2] с.

10. Шур, Васіль. Беларускія ўласныя імёны : беларуская антрапаніміка і тапаніміка : дапаможнік для настаўнікаў / Васіль Шур. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. - 237, [2] с.

11. Шур, Васіль Васільевіч. Малая і вялікая радзіма ў анамастыконе пісьменнікаў : [манаграфія]/ Васіль Шур, Вольга Слівец. - Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2019. - 170 с.

12. Юрэвіч, Уладзімір Міхайлавіч. Слова жывое, роднае, гаваркое… / Уладзімір Юрэвіч. - Мінск : Маст. літ., 1998. - 282, [2] с.

13. Яшкін, Іван Якаўлевіч. Слоўнік беларускіх імёнаў / І. А. Яшкін. - Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. - 135 с.